# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 22 красавіка 1999 года, чацвер, № 8 (1800)


АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## ЭКС-ПРЭЗІДЭНТ СССР МІХАІЛ ГАРБАЧОЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

15 красавіка ў Мінску адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларусь, Расія і новая Еўропа" з удзелам Міхаіла Сяргеевіча Гарбачова. На ёй абмяркоўваліся актуальныя палітычныя праблемы, у тым ліку югаслаўскі канфлікт і звязанае з гэтым новае бачанне еўрапейскай бяспекі. Апрача



ўдзелу ў гэтай канферэнцыі, Міхаіл Сяргеевіч выступіў перад выкладчыкамі і студэнтамі Белдзяржуніверсітэта, а пасля ў Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі даў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. На прэс-канферэнцыі прысутнічалі таксама рэктар Белдзяржуніверсітэта Аляксандр Уладзіслававіч Казулін і прарэктар па міжнародных сувязях Уладзімір Аркадзьевіч Астапенка.

Як адзначыў былы прэзідэнт СССР, на міжнародным форуме ён збіраўся паразважаць аб будаўніцтве новай Еўропы і месцы ў ёй Расіі і Беларусі, аднак яму, як і ўсім іншым, давялося абмяркоўваць куды больш актуальную і разам з тым трагічную праблему кантынента — ваенныя дзеянні НАТО ў Югаславіі.

— Тое, што адбываецца цяпер у Югаславіі — гэта пачатак змянення ўсёй філасофіі сусветнага ўпарадкавання, падзел дзяржаў і народаў на некалькі катэгорый, адраджэнне пратэктаратаў і зон уплыву...

Мы не павінны абмяжоўвацца асуджэннем гэтай акцыі, але патрэбна зразумець, што ў сапраўднасці адбылося. Я не хачу абяляць Мілошавіча, бо ведаю ягоны ўклад у абвастрэнне сітуацыі. Але сутнасць у тым, што маленькая краіна стала плацдармам рэалізацыі гэтай новай палітыкі, на яе абрушана ўся сучасная ваенная магутнасць.

Справа ў тым, наколькі я разумею, што НАТО цяпер вельмі важна паказаць, што толькі яно здольна дапамагчы свету ў вырашэнні падобных праблем, што ААН і АБСЕ бездапаможныя, што сама Еўропа слабая для гэтага, а Расію проста не варта дапускаць да прыняцця рашэння. Гэта ўжо становіцца відавочным, як і тое, што дамінуе тут амерыканскі дыктат. А гэта падштурхоўвае так званыя "парогавыя" краіны да стварэння сваёй ядзернай зброі, паколькі яны разумеюць, што ў такім аднапалюсным свеце ім самім патрэбна абараняцца. Я лічу, што трэба спыніць кровапраліццё і дапамагчы нашым заходнім партнёрам, а я пакуль яшчэ лічу іх партнёрамі, выбрацца з той ямы, у якую ўсе мы разам трапілі ў сувязі з гэтым канфліктам. Трэба дапамагчы ЗША пазбавіцца комплексу пераможцы, — зазначыў Міхаіл Гарбачоў.

На думку Міхаіла Сяргеевіча, гісторыя падзялілася на два тэрміны: да 23 сакавіка, калі пачаліся ваенныя дзеянні НАТО ў Косаве, і пасля гэтай даты. Чалавецтву цяпер ужо пагражае новая хваля ахаладжэння ў адносінах дзяржаў і нават варожасці.

Міхаіл Гарбачоў станоўча ацаніў паездку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Бялград. Ён таксама заявіў, што гатовы і сам быць пасрэднікам у перамовах



па спыненні югаслаўскага канфлікту, але паколькі і Ельцын, і Клінтан ставяцца да яго насцярожана, гэтая роля дастаецца іншым.

Выказаў экс-прэзідэнт СССР і свае адносіны да Саюза Расіі і Беларусі. Такое новаўтварэнне, на яго думку, можа адбыцца толькі пры ўмове захавання незалежнасці і роўнасці Расіі і Беларусі.

*Уласн. інф.*

СУСТРЭЧЫ

## Біблія для студэнтаў

Адна з аўдыторый факультэта міжнародных адносін 13 красавіка была цалкам запоўненая. Дзяўчаты і хлопцы чакалі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі Філарэта. Студэнты нягучна перагаворваліся, вырашалі нейкія свае праблемы. Той, хто зазірнуў сюды выпадкова, мабыць, нават не зразумеў бы з якой нагоды сабралася факультэцкая моладзь. Калі ўвайшоў Філарэт, зала ўмомант прыціхла і паднялася. Мітрапаліт павіншаваў усіх са святам Вялікадня.

Першым узяў слова дэкан факультэта Аляксандр Віктаравіч Шарапа. Ён прадставіў госця і папрасіў студэнтаў рыхтаваць пытанні.

Філарэт выказаў задавальненне магчымасцю сустрэцца са студэнцтвам, бо большая частка яго жыцця прайшла ў сценах духоўных



семінарый. Ён шмат гадоў быў рэктарам у семінарыі горада Загорска (цяпер Сергіеў Пасад), пасля ў Маскве. У сярэдзіне 70-х Філарэт становіцца епіскапам у Берліне і Экзархам Цэнтральнай Еўропы. У яго Экзархат уваходзілі прыходы ў ГДР, ФРГ, Заходнім Берліне і Аўстрыі. У Германіі Філарэт знаходзіўся каля пяці з паловай гадоў.

На аўдыенцыі ў Папы Рымскага Яна Паўла І памёр мітрапаліт тагачаснага Ленінграда Нікадзім. І Свяшчэнны Сінод перавёў у горад на Няве Мітрапаліта Мінскага Антонія. А Мітрапаліта Берлінскага Філарэта — у Мінск. Вось ужо дваццаць гадоў Філарэт нясе слова Божае да беларусаў.

Напрыканцы сустрэчы Філарэт падарыў бібліятэцы факультэта міжнародных адносін трохтомную Біблію з каментарыямі дарэвалюцыйнага выдання. Першыя два тамы ўключаюць Стары Запавет, трэці — Новы Запавет.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

КАНФЕРЭНЦЫІ

8 красавіка адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя ветэранаў вайны і працы Белдзяржуніверсітэта.

На ёй былі абраныя ганаровы старшыня Савета ветэранаў Таццяна Яфімаўна ДУДАРАВА, старшыня Савета Іван Паўлавіч ЗЯЦЬКОЎ, намеснікі старшыні Савета Леанід Рыгоравіч ЦЕГІН і Аляксандр Рыгоравіч МАЧУЛА.

*Савет ветэранаў*

АБ'ЯВЫ

## Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ

*аб'яўляе конкурс*

на замяшчэнне пасады прафесара кафедры кіравання вышэйшай школы.

*Дакументы накіроўваць на адрас:*
**220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў.**
**Тэл. 222-83-15.**

А Ў НАС! А Ў ВАС?

# Госці з Амерыкі

Не паспелі нашы ліцэісты вярнуцца з-за акіяна, як амерыканцы нанеслі візіт у адказ. З Фларыды ў Мінск прыехалі шэсць чалавек: настаўнік Джордж Ролер (George Roller), яго сын Дэвід Ролер (David Roller), брат і сястра Чарльз Парсанс (Charles Parsons) і Крысціна Парсанс (Christine Parsons), Андрыян Бакарыза (Andrian Bacariza) і Нікалас О'Мэлі (Nicholas O'Malley).



Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы Інфармацыйнага агенцтва ЗША. Амерыканцаў цікавіла, якім чынам беларусы сочаць за сваім здароўем. У прыватнасці, якія лекі яны прымаюць, якімі сродкамі народнай медыцыны карыстаюцца. З гэтымі пытаннямі дапытлівыя хлопцы і дзяўчаты звярнуліся да 50 жыхароў нашай краіны. У сваю чаргу беларускія ліцэісты падчас знаходжання ў ЗША высвятлялі гэту сітуацыю ў 50 амерыканцаў. Па выніках гэтых своеасаблівых сацыялагічных даследаванняў плануецца выдаць кнігу і буклет.

Але амерыканцы ў Беларусі не толькі працавалі. Кожны дзень яны наведвалі альбо тэатры Мінска, альбо гістарычныя помнікі па ўсёй Беларусі. Самой Фларыдзе, адкуль прыехалі госці, толькі сто гадоў. І таму ім вельмі цікава дакрануцца да шматвяковай гісторыі нашых старажытных гарадоў. Найбольш іх уразіла Хатынь. Джордж Ролер, у прыватнасці, заўважыў, што амерыканцам проста неабходна гэта бачыць.

Сустрэліся амерыканскія школьнікі і беларускія ліцэісты на спартыўных пляцоўках. Але нашы хлопцы абышліся з гасцямі не гасцінна — у абедзвюх гульнях па футболе і баскетболе перамаглі.



*Вольга КАЗДЗЕРКА*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар

Так-так, не забудзьцеся ўключыць канал грамадскага Расійскага тэлебачання 2-га мая, а інакш не пабачыце чарговае пасяджэнне Клуба весёлых і знаходлівых. Тым больш што ў вышэйшай лізе дэбютуе каманда БДУ-2. Яе сапернікамі па 1/8 фіналу будуць каманды з Кубані, Тбілісі і Кіева. Зараз "Беларускі універсітэт" не будзе паведамляць вынікі гэтай гульні. Бо лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Але, каб крыху заінтрыгаваць нашых чытачоў, скажу толькі: маскоўскія балельшчыкі прызналіся, што наша каманда ім вельмі спадабалася, раней нічога падобнага яны не бачылі.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

АФІША

## Запрашэнне на выставу

З 22-га па 30-е красавіка ў фае студэнцкага тэатра "На балконе", які знаходзіцца на 5-м паверсе галоўнага корпуса БДУ (праспект Ф. Скарыны, 4), пройдзе выстава маладога мастака Максіма Малышава. З 12 гадзін на працягу тыдня наведвальнікі змогуць пабачыць жывапіс і графіку мастака. Уваход вольны.

## Усе на фестываль!

У актавай зале галоўнага корпуса БДУ 22 красавіка а 18-й гадзіне пачнецца фестываль аўтараў і выканаўцаў аўтарскай і паэтычнай песні. А 23 красавіка на тым жа месцы ў тую ж гадзіну гледачоў чакае гала-канцэрт. Уваход па запрашэннях, якія можна набыць у дырэкцыі па справах культуры (пр. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, пакой 211, тэл. 220-42-07).

# НАВУКА БДУ Ў 1998 ГОДЗЕ

*Статус Белдзяржуніверсітэта як вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі Беларусі з'яўляецца пацвярджэннем яго значнай ролі ў вырашэнні праблем падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі і правядзенні навуковых даследаванняў па прыярытэтных накірунках навукі і тэхнікі ў рамках дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, міжвузаўскіх і універсітэцкіх праграм, фондаў фундаментальных даследаванняў і інфарматызацыі, іншых заданняў міністэрстваў, ведамстваў і кіраўніцтва БДУ.*

У 1998 годзе суб'ектамі навукова-даследчай работы ў саставе БДУ былі 4 інстытуты, 2 цэнтры (Нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій, Навукова-даследчы цэнтр маніторынгу азонасферы), навукова-даследчая частка (130 кафедраў, 51 навукова-даследчая лабараторыя пры факультэтах і кафедрах, 4 цэнтры — інфармацыйных тэхналогій, сацыялагічных і палітычных даследаванняў, праблем развіцця адукацыі, маркетынгавых даследаванняў).

У навуковай сферы універсітэта было занята 3050 штатных супрацоўнікаў, з якіх 1690 — прафесарска-выкладчыцкі састаў, а 1360 — работнікі навуковых установ і падраздзяленняў, сярод якіх 873 навуковыя супрацоўнікі. У ліку штатных супрацоўнікаў 226 дактароў навук і 1150 кандыдатаў навук.

У 1998 годзе абаронена 13 доктарскіх і 69 кандыдацкіх дысертацый. Лік выданняў склаў у справаздачным годзе 424 назвы, у тым ліку манаграфій — 84, зборнікаў навуковых працаў — 40, падручнікаў і дапаможнікаў — 222 (у тым ліку 83, зацверджаныя ў гэтай якасці), апублікавана 2759 артыкулаў і 1821 тэзіс дакладаў на канферэнцыях.

У справаздачным годзе на базе універсітэта праведзена 18 міжнародных канферэнцый (нарадаў, семінараў), 11 рэспубліканскіх, 32 універсітэцкія.

З 51 ВНУ і навуковымі арганізацыямі 18 замежных краін выконваліся 63 дагаворы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве ў разнастайных галінах навукі і тэхнікі. Асабліва плённым было супрацоўніцтва з ВНУ і навуковымі арганізацыямі Германіі (16 дагавораў), Польшчы (11 дагавораў), Расіі (11 дагавораў).

З замежнымі партнёрамі з Паўднёвай Карэі, Індыі і Алжыра падпісана 7 кантрактаў. Установамі і падраздзяленнямі універсітэта выконваліся 24 праекты па 15 праграмах (фондах).

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнымі прэміямі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі былі ўзнагароджаны: загадчык лабараторыі эліёнікі НДІ ПФП, загадчык кафедры фізічнай электронікі, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Ф.Ф. Камароў за цыкл працаў "Распрацоўка новых метадаў праектавання і развіццё фізіка-тэхналагічных асноў стварэння высокіх тэхналогій вытворчасці канкурэнтаздольных мікраэлектронных вырабаў" (у сааўтарстве); прафесары кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі В.А. Ямелічаў і Р.І. Тышкевіч, дацэнт А.І. Мельнікаў за вучэбны дапаможнік "Лекцыі па тэорыі графаў" (у сааўтарстве з загадчыкам аддзела ІМ НАНБ В.І. Сарванавым).

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ганаровае званне "Заслужаны дзеяч Рэспублікі Беларусь" прысвоена дэкану фізічнага факультэта прафесару В.М. Анішчыку за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, падрыхтоўку высокакваліфікаваных навуковых кадраў.

Супрацоўнікі кафедры фізікі паўправаднікоў: загадчык лабараторыі В.С. Варычэнка і галоўны навуковы супрацоўнік А.М. Зайцаў — ушанаваныя Другой прэміяй Аб'яднанага Інстытута ядзерных даследаванняў (г. Дубна) за навуковую працу "Роля іянізацыйных і ядзерных страт энергіі цяжкіх іёнаў у фармаванні дэфектнай структуры ў неметалічных крышталях".

У сувязі з 20-годдзем з дня заснавання і за вялікія дасягненні ў арганізацыі і правядзенні навуковых даследаванняў у галіне хіміі, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, распрацоўку і ўкараненне перадавых хімічных тэхналогій калектыў НДІ фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта першым з навуковых арганізацый у рэспубліцы ўзнагароджаны Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вялікая група навуковых супрацоўнікаў атрымала высокія ўзнагароды:

галоўны навуковы супрацоўнік акадэмік НАНБ В.В. Свірыдаў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і Ганаровай граматай БелВАК РБ;

дэкану хімічнага факультэта, загадчыку лабараторыі хіміі тонкіх плёнак і фотатэхналогій прафесару Г.А. Браніцкаму нададзена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь";

прарэктар па навуковай рабоце БДУ, загадчык лабараторыі хіміі фатаграфічных працэсаў доктар хімічных навук С.К. Рахманаў узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

загадчык аддзела хіміі цэлюлозных матэрыялаў акадэмік НАНБ Ф.М. Капуцкі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, БелВАК і Дзяржаўнага канцэрна "Белбіяфарм";

загадчык лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў Т.Л. Юркштовіч узнагароджана Ганаровай граматай Дзяржаўнага канцэрна "Белбіяфарм".

7 супрацоўнікаў НДІ ФХП узнагароджаны Ганаровымі граматамі і 4 супрацоўнікі — граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. 14 супрацоўнікаў атрымалі ганаровыя граматы Белдзяржуніверсітэта.

# АДЗНАЧАНЫ ПРЭМІЯМІ

***Адбылося штогадовае пасяджэнне камісіі па прысуджэнні прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі, а таксама прэмій за лепшую навуковую працу студэнтаў. Нагадаем, што прэмія У. І. Пічэты надаецца за працы ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, а прэмія А. Н. Сеўчанкі – за працы ў галіне прыродазнаўчых навук.***

*На прэмію імя У. І. Пічэты былі прадстаўлены наступныя працы:*

1. Цыкл працаў "Развіццё тэорыі расследавання злачынстваў" прафесара кафедры крыміналістыкі **А. В. Дулава**;

2. Цыкл працаў "Тэорыя і методыка журналісцкай творчасці і журналісцкага майстэрства" прафесара кафедры сацыялогіі журналістыкі **Б. В. Стральцова**;

3. Цыкл працаў у галіне археалогіі прафесара кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін **Э. М. Загарульскага.**

*На прэмію імя А.Н. Сеўчанкі былі вылучаны наступныя працы:*

1. Цыкл працаў "Эколагагеаграфічныя даследаванні прыродных комплексаў Беларусі для мэтаў іх рацыянальнага выкарыстання і аховы". Аўтары — загадчык кафедры глебазнаўства і геалогіі прафесар **В. С. Аношка**, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі прафесар **В. Н. Кісялёў**, загадчык сектара маніторынгу глеб НДЛ экалогіі ландшафтаў пры геаграфічным факультэце дацэнт **С. М. Зайко**, загадчык НДЛ экалогіі ландшафтаў пры геаграфічным факультэце, доктар сельскагаспадарчых навук, дацэнт **В. М. Яцухна**;

2. Цыкл працаў "Свабоднарадыкальнае пашкоджанне клеткі і механізмы абарончага дзеяння прыродных і сінтэтычных антыаксідантаў". Аўтары — загадчык НДЛ праблем тэрмарэгуляцыі ў чалавека і жывёлаў пры кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлаў доктар хімічных навук **У. А. Касцюк**, вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ праблем тэрмарэгуляцыі ў чалавека і жывёлаў пры кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлаў кандыдат біялагічных навук **А. І. Патаповіч**;

3. Цыкл працаў "Сінтэз, фізіка-хімічныя і медыка-біялагічныя ўласцівасці мадыфікаваных цэлюлоз і лекавыя прэпараты на іх аснове". Аўтары — загадчык аддзела хіміі полісахарыдаў НДІ ФХП прафесар **Ф. М. Капуцкі**, загадчык лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў НДІ ФХП кандыдат хімічных навук **Т. Л. Юркштовіч.**

У галіне сацыяльных і гуманітарных навук прэміяй адзначаны цыкл працаў "Развіццё тэорыі расследавання злачынстваў" прафесара кафедры крыміналістыкі **А. В. Дулава**. Гэтыя працы прысвячаюцца пошуку шляхоў павышэння якасці расследавання злачынстваў. Важнай часткай гэтага цыкла стала распрацоўка псіхалагічных праблем следства: псіхалагічны аналіз пры падрыхтоўцы следчых дзеянняў, псіхалагічная падрыхтоўка ўдзельнікаў да будучага следчага дзеяння, псіхалагічная падрыхтоўка следчага і г.д. Пры гэтым даюцца каштоўныя практычныя рэкамендацыі па гэтай малараспрацаванай у навуцы праблематыцы. Вельмі важным накірункам даследчай дзейнасці аўтара з'яўляецца выпрацоўка навуковых і практычных рэкамендацый для расследавання асобных відаў злачынстваў, а таксама распрацоўка тэорыі тактычных аперацый.

У галіне прыродазнаўчых навук вылучаны цыкл працаў "Эколага-геаграфічныя даследаванні прыродных комплексаў Беларусі для мэтаў іх рацыянальнага выкарыстання і аховы" пад аўтарствам загадчыка кафедры глебазнаўства і геалогіі прафесара **В. С. Аношкі**, загадчыка кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі прафесара **В. Н. Кісялёва**, загадчыка сектара маніторынгу глеб НДЛ экалогіі ландшафтаў пры геаграфічным факультэце дацэнта **С. М. Зайко**, загадчыка НДЛ экалогіі ландшафтаў пры геаграфічным факультэце, доктара сельскагаспадарчых навук, дацэнта **В. М. Яцухны**. Працы абгрунтоўваюць і развіваюць канцэпцыю аб геатэхнічных сістэмах як непарыўным адзінстве прыроднага і антрапагеннага блокаў у ландшафце. У адпаведнасці з гэтым падыходам падаюцца вынікі шматгадовых даследаванняў прыроднага асяроддзя, натуральных працэсаў фармавання ландшафтаў і аналізу наступстваў антрапагеннага ўздзеяння на іх. Атрыманыя вынікі дазволілі аўтарам распрацаваць канкрэтныя рэкамендацыі па рацыянальным карыстанні і ахове прыродных рэсурсаў розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама прагназіраванні развіцця ландшафтаў пад уздзеяннем планаваных антрапагенных фактараў. У прыватнасці, распрацаваны і ўкараняюцца ў практыку гаспадарчага карыстання прынцыпы глебаабарончай сістэмы земляробства з контурна-меліярацыйнай арганізацыяй тэрыторый.

Лепшай студэнцкай працай у галіне сацыяльных і гуманітарных навук была прызнана праца выпускніка філалагічнага факультэта 1998 года **А. Дуброўскага** "Вобразны свет Рыгора Барадуліна". У галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук лепшай сярод студэнцкіх была прызнана праца студэнта 5-га курса фізічнага факультэта **А. Гусакова** "Электрадынаміка карбонавых нанатрубак: праводнасць, павярхоўныя хвалі, кампазіты".



# Запрашае NOVA

У галерэі візуальных мастацтваў NOVA працуюць дзве фотавыставы — "Мая чужая вайна" і "Новы позірк на Мінск".

"Мая чужая вайна" — персанальная выстава мінскага фотамастака Ігара Пешахонава. Экспазіцыя — гэта ўспамін аб адным з найбольш ганебных эпізодаў з гісторыі былога СССР — Афганскай вайне, дзе аўтар выконваў свой "інтэрнацыянальны абавязак". Ігар Пешахонаў — адзін з самых вядомых фотамастакоў Беларусі. Фатаграфіяй пачаў займацца з сямігадовага ўзросту. Ладзіў свае персанальныя выставы ў Германіі, Францыі, Англіі і інш. Яго работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях. "Мая чужая вайна" першапачаткова не задумвалася як планамерная акцыя. 19-гадовы Ігар, ідучы на вайну, проста захапіў з сабой фотаапарат. Можа, таму фотаздымкі так непадобныя да газетна-экспазіцыйных. "Мая чужая вайна" — гэта хроніка афганскай бойкі, яе адваротны бок. Хроніка чалавечага болю, дзіцячых слёз, хроніка жыцця і смерці, чалавечай адзіноты на вайне. На здымках няма прамой выявы вайны. Асноўныя героі — прырода і людзі, але ў іх выглядзе, у змрочным небе — прадчуванне хуткай бяды.

І другая экспазіцыя "Новы позірк на Мінск" — вынік конкурсу, праведзенага Франка-беларускай залай інфармацыі аб сучаснай Францыі з мэтай пазнаёміць жыхароў гэтай краіны з Мінскам. На конкурс было прадстаўлена 70 работ. Лепшыя фатографы атрымалі прызы і падарункі, а іх работы склалі аснову экспазіцыі. Пераважна гэта вучні Алены Мілюкінай. "Новы позірк на Мінск" — прыклад творчага падыходу да фатаграфіі. Аўтары выкарыстоўваюць калаж, мантаж. Новы позірк на Мінск — гэта людзі Мінска, масты і паркі, неба і сонца Мінска, знаёмы і незнаёмы родны горад.

Упэўнена, што глядач, які наведае экспазіцыі, адчуе сапраўдную асалоду.

*Таццяна ЧОРНАЯ*

# Лекцыі забудуцца, а песні застануцца

На Дабравешчанне, 7 красавіка, на геафаку была наладжана вечарына "Дзень добры, вясна!" Гэта было ўжо не першае такое на факультэце. Адбылося мерапрыемства дзякуючы энтузіязму яго ўдзельнікаў — дацэнта кафедры беларусазнаўства Людмілы Уладзіміраўны Хрышчановіч і студэнтаў 1-2 курсаў.

Свята пачалося з закліку да вясны хутчэй прыходзіць і народных песень, прымеркаваных да абраду яе сустрэчы. З якім натхненнем удзельнікі свята спявалі фальклорныя песні і вадзілі карагоды ў гонар чараўніцы-вясны, якім задорам свяціліся іх твары — словамі перадаць немагчыма. Такое трэба толькі бачыць.

Дзяўчат, якія пачалі свята, падтрымалі і хлопцы. Сярод іх нельга не адзначыць Вадзіма Грышчанку, які выдатныя спевы дапаўняў бліскучым акцёрскім майстэрствам. Шчырымі ўсмешкамі гледачы сустракалі і размовы хлопцаў пра сваіх "зазноб" і іх крыўды, пра бацькоў, якія "спачатку вучаць хадзіць і гаварыць, а потым прымушаюць сядзець дома і маўчаць". Не абышлося і без жартаў у бок выкладчыкаў факультэта. Вельмі спадабалася гледачам выдатная ігра на жалейцы Жэні Мельніка. Былі таксама прадэманстраваны народныя гульні "Баяры" і "Груша". Дзяўчаты загадвалі загадкі, прымушаючы праяўляць кемлівасць не толькі сваіх хлопцаў, але і гледачоў у зале. А тым, хто правільна адказваў на іх пытанні, уручаліся прызы.

Былі на свяце і госці. Так, нікога не пакінула абыякавым выступленне дзіцячага фальклорнага гурта з Фаніпаля. Увесь час, пакуль 5-гадовыя артысткі разам са сваімі маці спявалі і танцавалі, зал падтрымліваў іх апладысментамі.

Пасля гэтага гаспадары зноў працягнулі свята. Хлопцы і дзяўчаты спявалі разам не горш, чым паасобку, паказваючы сапраўднае майстэрства і прафесіяналізм, якому можна па-добраму пазайздросціць. Вельмі эфектна глядзеўся ў іх выкананні і беларускі танец кракавяк.

Былі на гуканні вясны і ўдзельнікі гурта "Тутэйшая шляхта" Белдзяржуніверсітэта. Госці прадставілі на свяце дзве новыя песні, а таксама выканалі некалькі шырока вядомых і любімых кожным беларусам народных песень.

Напрыканцы вечарыны студэнты-гаспадары зноў выйшлі на сцэну для выканання прыпевак пра сваё жыццё: блізкія экзамены, "шпоравы бізнес", выкладчыкаў і дэкана. Ну, а пасля фінальных танца і песень гледачы яшчэ доўга апладзіравалі ўдзельнікам свята і скандзіравалі: "Малайцы!"

Малайцы! Іншае слова цяжка падабраць, ацэньваючы прайшоўшае свята. Так характарызавалі вечарыну амаль усе, з кім мне ўдалося пагутарыць. І кожны з суразмоўцаў выкарыстоўваў у адносінах да ўдзельнікаў прыметнікі ў найвышэйшай ступені параўнання. Так, дэкан геафака, прафесар І.І. Пірожнік сказаў: "Калі на факультэце ўсе будуць вучыцца так, як сёння святкавалі, то першае месца па паспяховасці мы нікому не саступім. Удзельнікі свята вельмі добра сябе праявілі, а мы заўсёды вельмі прыязна ставімся да ўсяго, што робяць студэнты на карысць сабе і тым, хто побач з імі". "Гэта ўжо не першая вечарына такога кшталту на факультэце, — адзначыў намеснік дэкана М.М. Брылеўскі. — І яна прайшла, як заўжды, вельмі выдатна. Прыемна, што ўжо з першага курса студэнты пачынаюць удзельнічаць у такіх мерапрыемствах. Хочацца падзякаваць кожнаму з яго ўдзельнікаў і асабліва выкладчыцы — Л.У. Хрышчановіч, якая змагла ўсё гэта арганізаваць".

Зразумела, пагутарыў я і з самой Людмілай Уладзіміраўнай. Было цікава, навошта ёй траціць асабісты час на пастаноўку такіх мерапрыемстваў. "Мая задача — далучыць моладзь да народнай культуры. Калі гуканне вясны на Беларусі пачыналі праводзіць з 1 сакавіка, то на Дабравешчанне яе гукалі паўсюдна. Я не стаўлю сваёй мэтай падрыхтаваць спевакоў народных песень, а проста хачу як мага больш людзей пазнаёміць з нацыянальнай культурай. Менталітэт любога народа захаваны ў фальклоры, без ведання якога нельга пазнаць душу народа. І хлусіць той, хто кажа, што ведае народ, не ведаючы яго фальклору. Студэнты з часам забудуць многія тэарэтычныя лекцыі, што ім чыталі, а песня, якую яны вывучылі да гэтай вечарыны, застанецца ў іх сэрцы на ўсё жыццё. Часта гавораць, што сучасная моладзь — гэта рэп, джаз, тэхна. І географы такія ж, але яны любяць роднае слова. Таму і ўдзельнікі, і гледачы атрымалі ад вечарыны вялікую асалоду. Бліскуча выступіла "Тутэйшая шляхта". Дзяўчынкі з Фаніпаля паказалі пераемнасць пакаленняў, прадэманстравалі, што дзеці беларусаў ведаюць свае звычаі і традыцыі. Яны таксама запомняць гэтае сваё выступленне, і, магчыма, праз гады хтосьці з іх апынецца і на геафаку. Наогул, задаволена і вечарынай, і ўдзельнікамі, і гледачамі. Радуе, што не засталося незадаволеных і абыякавых".

Вось такое свята адбылося на геафаку. Усім яго ўдзельнікам хочацца яшчэ раз сказаць вялікі дзякуй і пажадаць яшчэ не раз радаваць нас такімі выдатнымі вечарынамі.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

ВЫ ЧУЛІ?

# "Марк Шагал: ад Віцебска да Парыжа"

На факультэце журналістыкі прайшла не зусім звычайная навуковая канферэнцыя, бо была прысвечана яна толькі адной тэме — мастаку Марку Шагалу. У ёй прымалі ўдзел усяго 12 студэнтаў. Дакладчыкі адразу дамовіліся, каб не было манатоннасці, умоўна падзяліць творчасць Шагала на некалькі частак.

У першай частцы расказвалася пра Віцебск як культурны цэнтр Беларусі ў пачатку XX стагоддзя і пра людзей, якія атачалі мастака. Зараз імя Шагала даволі вядомае ў Беларусі, а вось чалавека, які дапамог мастаку зрабіць першыя крокі ў жывапісе, амаль ніхто не прыгадвае. Менавіта настаўніку Шагала Пэну прысвяціла свой даклад Кацярына Марынава "Пэн — настаўнік Шагала".

Даклад Аляксандра Бянько меў назву "Шагал і Бэла" і прысвячаўся адносінам паміж мастаком і яго жонкай. Жонкай-музай. Упершыню на рускай мове прагучалі ўспаміны Бэлы пра Шагала, яе лісты да каханага. Адзінай крыніцай інфармацыі, якой карыстаўся Аляксандр, быў Інтэрнэт, бо, да нашага вялікага сораму, у рускамоўных крыніцах імя Бэлы амаль не ўзгадваецца, не гаворачы ўжо пра яе ўспаміны.

Другая частка прысвячалася творчасці Шагала. Кацярына Зенава і Віка Целяшук даследавалі сімволіку колеру ("Колер у Шагала").

У трэцяй частцы распавядалася пра Шагала-творцу. Бо ён не толькі быў геніяльным мастаком, але і пісаў прозу і паэзію. Ён нават надрукаваў кнігу "Маё жыццё". Свой даклад па ёй падрыхтаваў Андрэй Ганчаронак ("Жыццё пасля жыцця").

У чацвёртую частку ўваходзілі даклады, у якіх адлюстроўвалася тое, як і што пісалі і пішуць пра Марка Шагала. Кірыл Жываловіч ("Вяртанне майстра") даследаваў вяртанне Шагала да яго суайчыннікаў, дзякуючы якім нам зараз вядома многае пра віцебскага мастака. Кірыл ездзіў у Віцебск, размаўляў з супрацоўнікамі музея.

А вось Марына Дубіна працавала з прэсай. На жаль, яе рэзюмэ было не вельмі суцяшальным: імя Марка Шагала ў сённяшніх газетах узгадваецца часцей за ўсё з нагоды крадзяжоў у музеях.

І "разынкай" канферэнцыі стала праца Аляксандра Рынкевіча ("Мастацтва Шагала — мастацтва моды"). Ён пабываў у Віцебску, дзе прайшоў паказ мадэляў аддзення, якія навеяны творчасцю Шагала.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# Плыць, плыць, плыць...

Гамана, вада, святло. Рознакаляровая гама купальнікаў. Танюткія дзявочыя і мускулістыя хлапечыя таліі. Усё гэта агульнауніверсітэцкае свята — спаборніцтва па плаванні.

Памятаеце старую показку? "Уяўляеш, арганізавалі нядаўна чэмпіянат па плаванні. Першым прыйшоў прас, другой — сякера, а трэцім — я". Тут усё было інакш. Хаця былі і фальстарты, і памылкі, і неактыўнасць балельшчыкаў... Але былі і свае героі. Напрыклад, перад дзяўчатамі, што плылі адну з самых цяжкіх дыстанцый — 100 метраў батэрфляем, — проста хацелася зняць капялюш (у сэнсе, купальную шапачку). Усе героі першага і другога дня спаборніцтваў — 7 і 8 красавіка — былі заўважаны і адзначаны, можа, і не каштоўнымі прызамі, затое медалямі і граматамі. Ну, так прынята ў БДУ: лепшай і найвышэйшай узнагародай становіцца рост прэстыжу факультэта і павагі да яго.

Што сапраўды парадавала, дык гэта баявітасць кожнай каманды і нецярплівае здаровае жаданне перамагчы, а не проста праплыць дыстанцыю дзеля "галачкі". Толькі на другі дзень спаборніцтваў некаторыя факультэты знялі сае каманды з эстафеты, перакрэсліўшы гэтым усе шанцы нешта змяніць у раскладзе пераможцаў. А ён, дарэчы, выглядаў наступным чынам.

Бяспрэчным лідэрам, што далёка ззаду пакінуў астатніх удзельнікаў, стаў юрыдычны факультэт — у яго 40 ачкоў і першае месца (у чым немалая заслуга мужчынскай каманды і асабіста майстра спорту Яўгена Сізікава, а таксама Дзяніса Гадзяцкага). Другое месца нечакана, а можа і заканамерна, адваяваў філасофска-эканамічны факультэт, набраўшы 36 ачкоў. Ну, а на прыступку ніжэй на п'едэстале гонару размясціўся факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі з 30 ачкамі. Усе астатнія факультэты хоць і набралі менш пераможных балаў, вельмі нядрэнна выглядалі ў адзіночных заплывах. Спадзяюся, што на сесіі ім так "плаваць" не давядзецца.

*Вікторыя ЦЕЛЯШУК,*
*студэнтка факультэта журналістыкі*

# АСКОЛАК РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Кандыдат гістарычных навук Надзея Аблава займаецца гісторыяй міжнародных адносін у новы і найноўшы час. Навуковую стажыроўку ёй давялося праходзіць у Харбіне — адным з чатырох буйнейшых цэнтраў расійскай эміграцыі. Па розных дадзеных, менавіта у ім пражывала ад 200 да 400 тысяч рускіх.

У савецкі час Харбін называлі апорнай базай белабандытаў і злосных ворагаў Савецкай улады. На самой справе, даўшы магчымасць рускім уцекачам — байцам белых войскаў, пасяліцца на гэтай тэрыторыі, Харбін і Кітайская усходняя чыгунка аказаліся апошнім асколкам Расійскай імперыі, дзе дарэвалюцыйны ўклад жыцця захаваўся яшчэ па меншай меры на два дзесяткі гадоў. А ў некаторых праявах — і па сённяшні дзень. Таму ў многіх з тых, хто пабываў нават у апошняе дзесяцігоддзе ў Харбіне, часта ствараецца ілюзія падарожжа ў часе. Асабліва моцным гэтае адчуванне бывае зімой, калі заснежаныя гарадскія кварталы вельмі падобныя да рускіх правінцыйных гарадоў пачатку XX стагоддзя: Казань, Кастрама.


Знакамітая Чурынская крама, дзе калісьці бясплатна давалі чырвоную ікру

Хаця навуковая зацікаўленасць дацэнта факультэта міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта Надзеі Аблавай ляжыць у галіне даследаванняў міжнародных адносін на Далёкім Усходзе, мацнейшыя ўражанні ад рускага Харбіна аформіліся ў напісанне манаграфіі па гісторыі КУЧ і расійскай эміграцыі ў Кітаі.

**— Наколькі складана было атрымаць у Харбіне магчымасць вывучаць матэрыялы па белай эміграцыі?**

— Кітайцы — даволі закрытая нацыя. Да таго ж, што датычыць Харбіна, яны ўвогуле забыліся, што той пабудаваны рускімі. Па існуючай легендзе, гэта горад кітайскага паходжання, які ўзнік у XV-XVI стагоддзях. Хаця ўзведзены ён на тэрыторыі Манчжурыі, якая доўгі час заставалася пустэльнай, таму што ханьцам там сяліцца не дазвалялася. Харбін узнік менавіта дзякуючы будаўніцтву Кітайскай усходняй чыгункі.

Пускаць у свае «гістарычныя засекі» кітайцы, зразумела, не любяць. Нядаўна адзін мой артыкул трапіў у Інтэрнэт. Маскоўскія даследчыкі, якія звярнулі на яго ўвагу, проста не паверылі спасылкам на кітайскія архівы.

**— Такім чынам, у архівы вы ўсё ж такі трапілі. Як у вас гэта атрымалася?**

—Толькі пасля вялікага скандалу. Я стала даказваць, што, як для кожнага гісторыка, для мяне вялікае значэнне маюць, зразумела, архівы. Даследчыцкую літаратуру адшукаць можна, але архіўныя дакументы — гэта аснова асноў. Я пачала тэлефанаваць у наша пасольства. У выніку, для рашэння гэтага пытання з гарадскімі ўладамі нават прыязджаў з Пекіна прадстаўнік пасольства, адказны за стажыроўку. Яны вымушаны былі пусціць мяне ў Харбінскі правінцыйны архіў: гарадскі ў той час быў закрыты на пераезд. У ХПА я працавала ў нязручных умовах. Мяне пасадзілі ў нейкі кабінет. Па вопісе я заказвала справы. У час абеду гэтыя справы забіралі, замыкалі мяне ў пакоі на ключ. Гадзіну я чакала вяртання работнікаў. Так цягнулася крыху больш за месяц, пакуль мне не сказалі, што справы закончыліся. Я мала ў гэта верыла, але намнога пазней, калі давялося ўжо працаваць у Хабараўскім дзяржаўным архіве, даведалася, што, калі ў 1945 годзе савецкія войскі вызвалілі Манчжурыю, многа дакументаў было вывезена архіўнымі работнікамі НКВД Далёкага Усходу. Яны вывезлі большасць дакументаў з эмігранцкіх фондаў, сярод якіх былі і асабістыя справы рускіх уцекачоў, матэрыялы эмігранцкіх арганізацый, у тым ліку і антысавецкіх. Так што кітайцы неабавязкова хлусілі, калі запэўнівалі, што нічога ў іх больш няма.

**— Ці можна вылучыць якія-небудзь асаблівасці далёкаўсходняй эміграцыі?**

— У адрозненні ад эміграцыі еўрапейскай, прадстаўнікі якой абмяжоўваліся ў асноўным палітычнай дзейнасцю, белыя рускія вялі ўзброеную барацьбу супраць Савецкай улады з тэрыторыі Кітая амаль да жніўня 1945 года. У Харбіне было нямала ваенных арганізацый, асабліва казацкіх, якія падпарадкоўваліся вядомаму яшчэ з часоў грамадзянскай вайны атаману Рыгору Сямёнаву. У 1929 годзе з іх актыўным удзелам узнік вядомы яшчэ па школьных падручніках савецка-кітайскі ўзброены канфлікт на КУЧ. Ваенныя атрады белых рускіх выступалі на баку кітайцаў. І пазней, пасля таго, як ў 1931 годзе пачалася акупацыя Манчжурыі Японіяй, рускія фарміраванні з поўнага блаславення японскіх уладаў праводзілі ваенныя вылазкі на тэрыторыю сумежнага савецкага Далёкага Усходу. У мяне ёсць нямала архіўных сведчанняў гэтаму. Напрыклад, звесткі аб дзейнасці расійскай фашысцкай партыі ў Манчжурыі супраць СССР, у тым ліку і аб засылцы дыверсійных груп. У сваёй кнізе я дастаткова падрабязна аб гэтым пішу.

Белыя рускія — гэта, дарэчы, такі спецыфічны выраз, які характэрны для абазначэння менавіта эмігрантаў у Кітаі. Ён выкарыстоўваецца як у побыце, так і ў тагачасных дыпламатычных дакументах. У газетных артыкулах выкарыстоўваецца той самы тэрмін. Яго ж ужываюць і кітайскія крыніцы.

**— Прозвішчы якіх радавітых сем'яў сустракалі вы ў харбінскіх крыніцах?**

— Тут усё ізноў не так, як у Еўропе. Як прыгадвае Усевалад Іванаў, які жыў у той час у Харбіне, тут былі прадстаўнікі сем'яў Лапухіных, князей Львовых, Ухтомскіх, Галіцыных, але яны, відаць, пазней перабраліся ў Заходнюю Еўропу і ЗША. Але ў асноўным у Манчжурыю беглі людзі больш простыя, пераважна з Сібіры і Далёкага Усходу. А адкуль там радавітыя? Чыноўнікі высокага рангу? Так, сустракаліся. Генерал-губернатар Прыамурскага края Мікалай Гандаці, кіраўнік КУЧ Дзмітрый Хорват, знакаміты дзеяч зменавехаўства Мікалаў Устралаў. Адмірал Калчак таксама некаторы час жыў у Харбіне.

Яшчэ адной характэрнай асаблівасцю з'яўляецца шматнацыянальны састаў гэтай калоніі, які адлюстроўвае ўвесь спектр народаў Расійскай імперыі. Тут яшчэ да 1917 года існавалі нацыянальныя таварыствы: польскае, украінскае, армянскае, грузінскае... Пасля 1922 года пачалі ствараццa зямляцтвы: табольскія, казанскія, іжэўскія...


Адзіная з праваслаўных храмаў царква, якая яшчэ дзейнічае ў Харбіне



Пан Эдвард Стакальскі сустракаў рускіх стажораў як уласных унукаў

**— Магчыма, удалося знайсці і беларускую? Сярод работнікаў КУЧ маглі быць прадстаўнікі нашых буйных па тых часах чыгуначных станцый...**

— На жаль, сведчанняў менавіта аб нацыянальным аб'яднанні я пакуль не знайшла. Хаця згадкі аб выхадцах з Беларусі сустракаюцца даволі часта. Харбінскія старажылы захавалі некалькі паштовак з краявідамі Харбіна. Усе яны належалі сям'і чыгуначнага работніка Мікалая Сямёнава з Нова-Беліцы. Мяркуючы па змесце лістоў, беларусы ў Харбіне падтрымлівалі шчыльныя сувязі са сваімі землякамі. З другога боку, беларускі дырыжор Барыс Райскі атрымаў музыкальную адукацыю ў Харбіне, дзе яго бацька быў вядомым дзеячом культуры.

На нядаўняй канферэнцыі ў Хабараўску быў зроблены даклад аб рукапісных мемуарах Язэпа Германовіча як выкладчыка Харбінскага каталіцкага ліцэя, дзе ён расказвае аб каталіцкім і праваслаўным Харбіне, аб дзейнасці каталікоў у Кітаі і аб арышце групы выкладчыкаў Харбінскага ліцэя. І хаця рукапіс напісаны на беларускай мове, ніякіх сведчанняў аб існаванні беларускага нацыянальнага аб'яднання аўтар не прыводзіць. Мая папярэдняя выснова: магчыма, нашы землякі ўдзельнічалі ў аб'яднаннях па канфесійных прыкметах, каталіцкіх ці праваслаўных.

**— Якім чынам будаваліся адносіны мясцовага насельніцтва і рускіх эмігрантаў?**

— Сама па сабе далёкаўсходняя эміграцыя складвалася з двух пластоў. Рускія прыйшлі на гэтую зямлю ўжо ў канцы XIX стагоддзя. Яны пабудавалі Харбін — велізарны рускі горад, які стаў галоўным чыгуначным вузлом Манчжурыі. Абслугоўвалі дарогу ў асноўным рускія — ад майстроў да чыноўнай эліты.

Стварэнне КУЧ — сур'ёзная знешнепалітычная акцыя Расіі, вялікі прарыў у дыпламатыі Вітэ. Яна мела важнае значэнне і для Савецкай улады. Пазней Бухарын назваў КУЧ рэвалюцыйным пальцам, які запушчаны ў Кітай.

Усе станцыйныя паселішчы ўздоўж КУЧ былі заселены рускімі людзьмі: чыгуначнымі рабочымі, настаўнікамі, дактарамі, гандлярамі, рамеснікамі. Гэтай тэрыторыі было нададзена права экстэрытарыяльнасці. Гэта была частка Расійскай імперыі, якая жыла па рускіх законах, са сваёй паліцыяй, судом, ахоўнай вартай. Чыгунка стала дзяржавай ў дзяржаве. Узровень жыцця тут быў вельмі высокі. Работнікі хутка нажывалі маёмасць, будавалі дамы, адкрывалі прадпрыемствы. Да 1917 года тут спакойна жыла багатая руская калонія, якая па прычыне свайго дабрабыту амаль ніяк не адрэагавала на ідэі рэвалюцыі. Пасля пачатку грамадзянскай вайны сюды рынуліся патокі ўцекачоў з усёй Расіі. Тут яны знаходзілі звыклы ўклад жыцця. Белыя рускія прыйшлі ў Манчжурыю, у адрозненні ад Германіі, Францыі, Чэхаславакіі, як «да сябе дадому».

**— Няўжо кітайцы не выкарысталі грамадзянскую вайну для таго, каб аднаасобна кіраваць чыгункай?**

— Спроба, і даволі ўдалая, была. У 1920 годзе быў падпісаны ўказ прэзідэнта Кітайскай Рэспублікі аб адмене права экстэрытарыяльнасці. У 1924 годзе было падпісана пагадненне аб сумесным савецка-кітайскім кіраванні. Але і пасля таго кітайскія ўлады пастаянна імкнуліся выцесніць Саветы з дарогі.

А да рускіх эмігрантаў кітайцы, дарэчы, ставіліся нядрэнна, таму што выкарыстоўвалі іх вопыт і майстэрства для абслугоўвання чыгункі. Да таго ж, гэта былі добрыя спецыялісты, прадпрымальнікі, якія ўкладалі уласныя сродкі ў развіццё эканомікі Манчжурыі. Да гэтага часу працуе знакамітая крама Чурына, які быў вядомым гандляром па ўсім рускім Далёкім Усходзе, меў філіі ў Карэі і Кітаі. Калі будавалі чыгунку, ён арганізоўваў гандаль чырвонай ікрой, якую напачатку даваў бясплатна, а потым пачаў гандляваць ёй. Кітайцы да гэтага часу падаюць чырвоную ікру з сырой цыбуляй — гэты звычай завезлі сюды рускія. Каўбасы гатуюцца тут па рускіх рэцэптах. Можна купіць салёныя гуркі, бужаніну, малако.



Асколак Расійскай імперыі сярод палёў кітайскага калгаса

**— Вядома, што перамога СССР у Вялікай Айчыннай вайне выклікала моцныя патрыятычныя настроі і многія эмігранты пачалі вяртацца на радзіму...**

— Так было і ў асяродку далёкаўсходняй эміграцыі. Яшчэ ў канцы вайны з Шанхая вярнуўся Аляксандр Вярцінскі, пазней — Алег Лундстрэм. Але многія белыя рускія з Манчжурыі вярталіся не па сваёй волі, а «праз ГУЛАГ». І перш за ўсё актыўныя дзеячы ваеннай эміграцыі. У той жа час прыкладна 7 тысячам рускіх шанхайцаў было адмоўлена ў атрыманні савецкага грамадзянства.

Пасля бясплатнай перадачы КУЧ Кітаю ў канцы 1952 года і выдання ўказа аб закліку рускіх з Кітая на асваенне цаліны, кітайскія ўлады ўсімі мерамі сталі спрыяць іх выезду ў СССР.

Рэпрэсіі супраць тых рускіх, што засталіся, узмацніліся падчас культурнай рэвалюцыі. У Харбіне хунвэйбінамі быў нават спалены Свята-Мікалаеўскі сабор — святыня горада. На гэтым месцы быў пастаўлены помнік героям культурнай рэвалюцыі. Але яно аказалася праклятым. Помнік доўга не прастаяў. Цяпер там проста маленькая клумба.

Я ўжо казала, што кітайцы ўвогуле не любяць прызнаваць якія-небудзь пазітыўны ўплыў Расіі на эканамічнае развіццё Манчжурыі і ўласна Харбіна. Апошнім часам яны сталі планамерна знішчаць кварталы рускай забудовы. На месцы рускіх могілак утварылі парк культуры і адпачынку. На месцы Прыстані ўзводзяцца сучасныя небаскробы. Дарэчы, была ў Харбіне і адзіная вуліца ва ўсім Кітаі, пакрытая брукам. У мяне ёсць падазрэнне, што яе таксама маглі заасфальтаваць. А гэта ж была такая асаблівасць Харбіна, як Крышчацік у Кіеве. Хаця некаторыя кітайскія гісторыкі ўсё ж змушаны адзначыць вялікі ўклад праваслаўнай царквы ў архітэктуру Харбіна.

**— Ці многа рускіх эмігрантаў засталося ў Харбіне?**

— Дзесяць гадоў таму іх было каля 30. Паводле апошніх звестак, засталося толькі 14. Адзін са знаёмых мне старых Мятавых, які ўзначальваў рускую абшчыну, памёр. Другі — пан Эдвард Стакальскі, ужо вельмі стары і хворы, быў звезены братам у Варшаву. Ён ніколі не быў жанаты, так і пражыў без сям'і, без дзяцей, год за годам губляючы сваё атачэнне. Усе яны вельмі цягнуліся да нас як да людзей з Расіі. Таму нам да слёз было цяжка з імі гаварыць. Яны ішлі да нас насустрач, пастаянна клікалі ў госці, увесь час наладжвалі пачастункі, заўжды растройваліся, калі мы сыходзілі. Вельмі трагічна ўсё гэта выглядала.

Для большасці рускіх харбінцаў, якія пакінулі горад, характэрны настальгічныя пачуцці. І сам горад ствараў такую аўру. Гэта нейк вельмі складана пераплялося: кітайская зямля і рускі ад пачатку горад, у якім людзі, якія прывезлі журбу па Расіі, доўгі час жылі ўсё ж паўнацэнным жыццём. Ва ўсялякім выпадку, пра гэта кажуць і пішуць многія з былых эмігрантаў.

Нават я, прыехаўшы туды, трапіла пад такі ўплыў. Хаця ні ў якую містыку не веру. Але ў розных месцах горада, у самых нечаканых сітуацыях раптам адчуваўся рускі дух. Кітайцы, відаць, разумеюць гэта вельмі добра і таму так спяшаюцца знішчыць сляды рускага ўплыву.

*Марына ЗАГОРСКАЯ*

# ТАЛІСМАН ЖЫЦЦЯ І ЛЮБОВІ

На хвілiначку адкрыем чароўную скарбонку, якой уладарыць планета Марс, і адзначым, што перавага тут аддаецца камяням чырвонага колеру. Адзін з іх — чароўны прыгажун сердалік. Што гэта за камень? Паспрабуем папулярна растлумачыць.

Самы распаўсюджаны на Зямлі мінерал — кварц ($SiO_2$) — сустракаецца розных колераў і таму мае многа імён: аметыст, цытрын, марыён, горны крышталь і інш. Кварц цвёрды (7 па шкале Маоса), адкрытакрышталічны. У музеі землязнаўства Белдзяржуніверсітэта амаль тысяча ўзораў кварцу. Скрытакрышталічная тонкавалакністая яго разнавіднасць — халцэдон. Ён знешне нагадвае па малюнку халадзец, бывае розных колераў і з разнастайнымі малюнкамі, у залежнасці ад гэтага мае многа назваў. Калі белы — кахалонг, зялёны — хрызапраз, сіні — сапфірын, чырвоны — сердалік... Малюнкі надаюць прывабны выгляд гэтаму каменю, і тады ён называецца агатам, оніксам, махавікам, сардоніксам і г.д. Разнавіднасцю халцэдона з'яўляецца ўсім нам знаёмы крэмень, які на зломе мае вострыя краі, забруджаны гліністымі дамешкамі. Сердалік у халцэдонавым княстве — самы яркі прынц. Само слова, верагодна, азначае "лікуючае сэрца" і мае рускае паходжанне. У назве можна заўважыць асаблівыя адносіны да каменя — радаснага, чароўнага. Камень з'яўляецца сімвалам рускай паэзіі срэбранага веку. Амаль уся інтэлігенцыя пачатку века захаплялася кактэбельскімі сердалікамі, з якімі ў першую чаргу знаёміў, дапамагаў збіраць, а больш дарыў паэт і мастак Максімільян Валошын. Сярод яго добрых знаёмых і жаданых гасцей былі Марына і Настасся Цвятаевы, Восіп Мандэльштам, Міхаіл Булгакаў, Аляксандр Грын, Мікалай Гумілёў і многія іншыя.



Жэода

Камень лічыцца талісманам жыцця і любові, якому шчыра верыў А.С. Пушкін. У яго былі два пярсцёнкі з сердалікам. Пра адзін з іх вядома, што яго падаравала Пушкіну графіня Варанцова ў 1822 годзе перад высылкай паэта з Адэсы. Яна верыла ў чароўную сілу гэтага талісмана і шчыра жадала засцерагчы сябра ад бяды. Пушкін гэты падарунак уславіў у вершах "Талисман", "Сожжённое письмо", "Храни меня, мой талисман". Паэт не разлучаўся з талісманам да канца сваіх дзён. Ён свята верыў у тое, што калі б талісмана не было, то дзівосны дар паэта аслабеў бы. Пасля смерці Пушкіна пярсцёнак належаў паэту Жукоўскаму, ад яго ён перайшоў да сына Паўла Васільевіча, а той падарыў І.С. Тургеневу. Тургенеў усю сваю маёмасць завяшчаў французскай спявачцы Паліне Віярдо, а яна знакаміты пярсцёнак у 1887 годзе перадала Пушкінскаму музею Аляксандраўскага ліцэя. На жаль, ён адтуль быў выкрадзены музейным служкам і прададзены. Ды дагэтуль так і не знойдзены.

Думаецца, што гісторыя пушкінскага талісмана не скончылася, таму што сердалік жыве вечна. Гэты камень аказаўся амаль што адзіным у культуры народаў сусвету, які не падпарадкаваўся капрызнай модзе. Яго любілі патрыцыі і плебеі, фараоны і земляробы, свецкія прыгажуні і прачкі. З сердаліку выразалі вазы, флаконы, свяцільні, а асабліва прывабнымі былі гемы. Упрыгожвала сябе сердалікам і знакамітая Клеапатра. Расійская імператрыца Кацярына заказала аўстрыйскаму ювеліру Ф. Абрахаму свой партрэт — гему, таксама з сердаліку. Нельга ўявіць сабе Кармэн без упрыгожання з палымянага ярка-чырвонага каменя. Сердалік настолькі ідэальна пасуе цыганам, што пэўна з'яўляецца іх талісманам. Калі народ "романэ чавэ" сапраўды прыйшоў з Індыі, тады трэба адзначыць, што самыя багатыя россыпныя радовішчы знаходзяцца на пласкагор'і Дэкан. Сустракаецца ён у Бразіліі, Урагваі, ёсць у Казахстане, на Урале, Чукотцы, Камчатцы, на Украіне і ў іншых месцах.



Аметыставы кварц



Карункавы агат з Мексікі

На Беларусі часцей сустракаюцца ўпрыгожанні з індыйскага сердаліку. Па традыцыі карáлі з Індыі складаюцца з 33 пацерак. Гэтая лічба азначае колькасць багоў ведыйскай міфалогіі. У Еўропе многія лічаць, што гэта адпавядае колькасці зямных год Ісуса Хрыста.

Са старажытных часоў сердаліку прыпісвалі магічныя ўласцівасці, яго лічылі добрым амулетам. На муміі Тутанхамона (XIV стагоддзе да н. э.) знайшлі розныя сердалікавыя вырабы: галаву змяі (засцерагала фараона ў замагільным свеце), падвескі ў выглядзе сэрца (увасабляла вечна жывую душу). Сердалікі выкарыстоўвалі ў медыцыне ў выглядзе парашкоў, мікстур і ў натуральным выглядзе (прыкладалі да балючых месцаў).

У наш час навукоўцы адзначылі нязначную радыяактыўнасць сердаліку, якая стымулюе арганічныя клеткі. Гэта ўздзеянне можна параўнаць з уласцівасцямі лекавых гразяў і некаторых мінеральных вод. Самая галоўная яго ўласцівасць — прыгажосць. Такі таямніча-чароўны, з цудоўнай назвай сердалік несумненна павышае настрой. Прыгожымі камянямі можна любавацца бясконца. На іх прыкладах можна вывучаць гісторыю, законы развіцця прыроды, напаўняць сэрцы дабрынёй.

Калі хто-небудзь захоча бліжэй пазнаёміцца з каменем кахання, які дорыць шчасце, здароўе, і яго родзічамі (кварцам і халцэдонам), прыходзьце ў "каменны храм" на геаграфічны факультэт. Вы адчуеце, што камяні сапраўды з'яўляюцца неабходным элементам гармоніі і прыгажосці.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00*

*22 КРАСАВІКА*
*Зак. 304.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча*